ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ

# Дзедзіч

Зберагчы і Навялічыць

№1(59) • САКАВІК 2010

**Увага!**

***25 сакавіка – Дзень Волі! Віншуем і запрашаем на Дзедзіч-Party!***




# ДЗЕНЬ ВОЛЬНЫХ

**25 сакавіка, у чацвер, маладых берасцейцаў чакае цудоўнае феерычнае шоў – з нагоды Дня Волі ладзіць студэнцкую вечарыну ў беларускім стылі "Дзедзіч-PARTY".**

Толькі не чакайце там нацыянальных строяў і фальклорных песень. Дзедзіч адкрывае берасцейцам сучасную беларускую музыку розных стыляў - ад рока да папсы. Беларускія тэксты, аранжыроўкі і нават беларускамоўны дыджэй чакаюць тых, хто прыйдзе на Дзедзіч-Party. Акрамя дыскатэкі ў праграме вечарыны таксама забаўляльныя конкурсы з прызамі, ад якіх вы будзеце смяяцца да слёз, «жывы гук»– маладая таленавітая спявачка PRANA, а для жадаючых - майстар-клас па традыцыйных і старажытных беларускіх танцах.

Дзедзіч-Party пачнецца ў адным з клубаў Берасця ў 19-00, а закончыцца тады, калі вырашаць самі удзельнікі (і там, дзе яны захочуць :)

25 сакавіка 1918г. беларускі народ гучна заявіў пра сваё права на годнае і вольнае жыццё, абвясціўшы незалежнасць Беларускай Народнай Рэспублікі.

Без гэтага палітычнага кроку не было б ані БССР, ані цяперашняй Рэспублікі Беларусь.

І хоць гэта свята пакуль не стала дзяржаўным, яго шырока адзначаюць усе тыя, хто ганарыцца нашай краінай, шануе яе гісторыю і па-сапраўднаму любіць свой народ.

**Квіток каштуе ўсяго 6.000 рублёў. Набыць яго, а таксама атрымаць больш падрабязную інфармацыю можна па тэлефоне (029) 227-52-12.**

**Усе, хто купіць квіток, атрымаюць святочную віншавальную паштоўку з нагоды Дня Волі! А тыя, хто захочуць запрасіць сяброў і набудуць адразу 5 квіткоў, 6-ы атрымаюць бясплатна! :)**

**Больш падрабязная інфармацыя - на сайце: http://dzedzich.org.**

**Сустрэча «У Кантакце»: http://vkontakte.ru/event16297106.**

**Запрашайце сяброў!**

**БЕЛАРУСКІ ФАРМАТ - НАШ ВЫБАР!**

**СУСТРЭНЕМСЯ!**

## У НУМАРЫ:

2 **РЭФЕРЭНДУМ** супраць росту пошлін на аўто

4 **РАЗМЕРКАВАННЕ** Плакаць ці смяяцца?

7 **А ЦІ БЫЎ ТОЙ ЛЕЎ?** Легенды Косаўскага палаца

8 **НАВОШТА НАМ БАЛОНЬЯ?** Што такое «Балонскі працэс»

## АДНЫМ РАДКОМ

### УВАГА! АПЫТАННЕ.

**Сябры! Журналістам «Дзедзіча» вельмі важна, што вы думаеце пра наша выданне. Адкажыце, калі ласка, на 4 пытанні і дашліце SMS з адказамі на нумар (029) 222-58-22 або на адрас: dzedzich@tut.by у выглядзе: № пытання - варыянты адказу (можа быць некалькі).**

**1. Я ЧЫТАЮ «ДЗЕДЗІЧ», ТАМУ ШТО:**

1. тэматыка гэтай газеты адпавядае маім поглядам;
2. знаходжу тут шмат цікавага і актуальнага;
3. газета не падобная на ўсе астатнія;
4. гэтую газету чытаюць мае сябры;
5. гэта адзіная альтэрнатыўная моладзевая газета;
6. яна бясплатная;
7. тут шмат файных анекдотаў;
8. гэта модна;
9. тут праўдзівая інфармацыя;
10. напішыце свой варыянт адказу.

**2. ЯК ДА ВАС ПАТРАПІЛА ГАЗЕТА?**

1. раздавалі ва ўніверсітэце;
2. узяў у сябра/знаёмага;
3. выпадкова патрапіла, першы раз чытаю;
4. звычайна ў дэканаце бяру :)
5. свой варыянт.

**3. ЧАГО НЕ ХАПАЕ ГАЗЕЦЕ?**

1. конкурсаў;
2. новых карэспандэнтаў/новых ідэй;
3. новага дызайну;
4. артыкулаў на гістарычную тэматыку;
5. артыкулаў на культурную тэматыку;
6. артыкулаў на грамадскую тэматыку;
7. артыкулаў на палітычную тэматыку;
8. свой варыянт.

**4. ЦІ ЖАДАЕЦЕ ВЫ ДАПАМАГЧЫ "ДЗЕДЗІЧУ"?**

1. Я магу распаўсюджваць газету сярод сяброў;
2. Я магу пісаць артыкулы ў "Дзедзіч";
3. Я магу паведамляць пра розныя падзеі, здарэнні;
4. Я хачу даведацца больш пра іншую дзейнасць "Дзедзіча". Напішыце тут свой е-мэйл або тэлефон;
5. Не, проста буду чытаць.

**Для першых пяці чалавек, якія дашлюць свае адказы на нумар (029) 222-58-22 або на электронны адрас: dzedzich@tut.by рэдакцыя падрыхтавала каштоўныя падарункі.**

РЭГІЯНАЛЬНЫ ПАРТАЛ
Dzedzich.org
Аператыўна, праўдзіва, трапна.
Тое, што цікава для берасцейскай моладзі.
НАШ партал
Пішам пра тое, што баяцца казаць іншыя
пра НАШЫ справы
Мы адкрыты для ўсіх меркаванняў.
dzedzich.org

# РЭФЕРЭНДУМ

## СУПРАЦЬ РОСТУ ПОШЛІН НА АЎТО

**Партыя БНФ фарміруе ініцыятыўную групу па правядзенні рэферэндуму супраць павышэння мытных пошлін на ўвоз у краіну аўтамабіляў.**

Дакладна пытанне, якое плануецца вынесці на рэферэндум, гучыць так: "Ці падтрымліваеце Вы заханванне памеру мытных пошлін на ўвоз у Рэспубліку Беларусь легкавых аўтамабіляў замежнай вытворчасці на ўзроўні 26 лістапада 2009 года?"

Павышэнне мытаў на ўвоз аўтамабіляў з'яўляецца вынікам стварэння Мытнага саюза, падпісанага кіраўнікамі Беларусі, Расеі і Казахстана. Партыя БНФ лічыць, што гэты саюз ігнаруе інтарэсы значнай часткі грамадзян Беларусі.

Паводле кіраўніка Берасцейскай абласной арганізацыі Партыі БНФ Дзмітрыя Шыманскага, гэтая праблема закранае большасць насельніцтва Беларусі, а асабліва Берасцейшчыны:

- У Берасці 100 000 машын на 300 000 насельніцтва. І ў асноўным гэта няновыя аўтамабілі з краін Еўропы. Таму зразумела, што павышэнне мыта прыйдзецца не даспадобы вельмі значнай колькасці берасцейцаў. Беларусь на працягу апошніх 10 гадоў ужо некалькі разоў падымала мытныя пошліны на аўтамабілі. І кожны раз – менавіта пад ціскам Расеі, бо сваёй вытворчасці, за выключэннем невялікай вытворчасці маральна састарэлых "Самандаў" мы не адкрылі. Дык чаму берасцейцы павінны сваімі грашыма падтрымліваць расейскі "ВАЗ"? Думаю, што наш урад хоча перакласці свае праблемы з напаўненнем бюджэта на галовы тых, хто можа зарабіць на патрыманую, але ж значна больш сучасную і бяспечнейшую за "Жыгулі" іншамарку.

Да 25 сакавіка павінна скончыцца фарміраванне ініцыятыўнай групы. Яе ўдарнай сілай і рухавіком кампаніі стануць прадстаўнікі Партыі БНФ, якія вылучаюцца кандыдатамі ў дэпутаты на мясцовых выбарах.

**У Берасцейскай вобласці таксама вядзецца запіс у ініцыятыўную групу па правядзенні рэферэндума. Усім, хто жадае далучыцца або дапамагчы кампаніі, можна звяртацца па тэлефонах: (029) 660-57-41, (029) 724-21-16, а таксама на е-мэйл: dzedzich@tut.by.**

**DZEDZICH.ORG**

# ПЕРАХОДЗЬ НА БЕЛАРУСКУЮ!

**Па ўсёй краіне набірае моц праект «Зрабі падарунак Беларусі — пераходзь на беларускую мову», распрацаваны і арганізаваны моладзевым рэсурсам «Вока». Галоўная ідэя праекта — адраджэнне і прапаганда мовы Багушэвіча і Багдановіча.**

Падобнымі тэзісамі ўжо неаднойчы карысталіся розныя грамадзкія кампаніі. Толькі на гэты раз справа пайшла далей за налепкі і значкі з заклікам гаварыць па-свойму — тым, хто не супраць авалодаць беларускай, прапануецца пакрокавая інструкцыя з тлумачэннямі вытокаў сённяшняй моўнай сітуацыі, псіхалагічнай дапамогай і вясёлымі ілюстрацыямі.

На малюнку, які аздабляе вокладку падручніка па хуткім засваенні роднай мовы, — беларуская моладзь, стылізаваная пад герояў амерыканскага анімацыйнага серыялу «South Park» — «Мы такія розныя — мы размаўляем па-беларуску». Сама кніга па механізме магчымага ўздзеяння нагадвае практычную псіхалогію Дэйла Карнэгі або папулярны твор Алена Кара «Лёгкі спосаб кінуць паліць». Паводле аўтараў беларускага падручніка, авалоданне роднай мовай гэта таксама справа псіхалагічнай моцы і перамогі асабістых комплексаў. Маўляў, разняволься — і гавары па-беларуску.

Апроч парадаў па самавыхаванні і паводзінах у сяброўскіх кампаніях, на працы і ў грамадскіх месцах, падручнік прапануе для азнаямлення беларускамоўныя рэсурсы, дзе можна знайсці ўдосталь музыкі, літаратуры і навін на роднай мове.

Першапачаткова чытач павінен вызначыцца, які ўзровень карыстання беларускай мовай яму пад сілу зараз засвоіць. Аўтары даюць магчымасць выбіраць з чатырох «праграм»:

1. Максімум. «Я размаўляю па-беларуску».
2. Пачцівы. «Я адказваю па-беларуску».
3. Сімпатык. «Я сімпатызую беларускай мове».
4. Мінімум. «Я паважаю права чалавека гаварыць сваёй мовай».

«74,5% грамадзян 10-мільённай Беларусі лічаць роднай беларускую мову, — у кнізе прыводзяцца вынікі апошняга перапісу насельніцтва. — Нягледзячы на гэта, па дадзеных маніторынгу лінгвістычнай камісіі Беларускага Хельсінкскага камітэта, беларуская мова сёння зведвае пэўныя цяжкасці: яна амаль вы-




ключаная са справаводства і з ужывання дзяржаўным чыноўніцтвам».

У сваіх развагах, разумеючы і наяўныя праблемы элементарнага страху вылучацца з натоўпу і невалодання лексікай ды граматыкай, аўтары сягаюць ледзьве не рэнесансных скарынаўскіх прадмоў і багушэвічавай прадмовы да «Дудкі»: «Кіньце пустыя дыскусіі аб тым, чаму нам варта размаўляць па-беларуску і чым беларуская мова лепшая альбо горшая. Гэта бессэнсоўныя спрэчкі. Беларуская мова лепшая, бо Яна нашая, і нам яе даў Бог».

На заканчэнне ў кнізе прыводзяцца шматлікія прыватныя гісторыі вядомых і невядомых у Беларусі людзей, а таксама ананімныя расповеды з інтэрнэту «Як я перайшоў на родную мову». У гэтых гісторыях паўстаюць і сваркі, і непаразуменні, і каханне на хвалі агульнага патрыятычнага абуджэння.

Ян Маўзер, вакаліст магілёўскага гурта «Маўзер», распавядае тут пра тое, як пасварыўся з дзяўчынай, якая ненавідзела беларускую мову: «Я перайшоў на беларускую. Яна заплакала і пабегла дадому. Потым тэлефанавала прасіць прабачэння — я размаўляў з ёй па-беларуску».

Нехта з тых, чые гісторыі надрукаваны ў кнізе, дзеліцца ўражаннямі ад размоў з украінцамі, калі рабілася сорамна за ўласную несвядомасць і рускамоўнасць. Нехта на хвалі гэтай жа несвядомасці падхапіў ініцыятыву іншых.

З'яўленне гэтага прадукта — толькі першы крок, паколькі шэраг грамадскіх акцый пачнецца пазней. Па ўсёй Беларусі валанцёры са стужкамі і значкамі «Надоело говорить? Размаўляй!» будуць раздаваць падручнік на вуліцах, у школах і ўніверсітэтах.

Спампаваць падручнік можна тут: http://vitalbel.at.tut.by/bymova.pdf

**DZEDZICH.ORG**

# КАТЯ ПРОНЕВИЧ: “PRANA – ЭТО Я И МОЕ ТВОРЧЕСТВО”

**Екатерина пишет песни с 2003 года. Но активно выступать начала только в 2010. 22 января в ГДК «Кирпич» состоялся ее дебютный сольный концерт. А спустя три недели – 15 февраля – в этом же заведении Прана оказалась в центре другого яркого музыкального события – квартирника ALL YOU NEED IS LOVE, посвященного Дню всех влюбленных.**

**Катя, это твое второе сольное появление на брестской публике. Каковы ощущения? Как тебя принимают?**

Я очень рада, что начала выступать. Много лет я пела дома, для родных и друзей. Но выступать на публике – это другое. Мне кажется, что меня тепло принимают. Люди подходят, говорят приятные слова, благодарят. Значит, есть смысл дальше творить, заниматься музыкой. Теплые слова греют, вдохновляют на дальнейшую работу.

**То есть музыка - это твоя работа?**

Пока это хобби. Но и оно требует больших усилий. Я каждый день по несколько часов занимаюсь вокалом, пою, совершенствуюсь. Это приносит мне удовольствие. Это мое.

**Музыка всегда будет твоим хобби? Или ты рассчитываешь, что в будущем она станет твоей профессией?**

Мы предполагаем – Бог располагает. Если хочешь насмешить Бога – расскажи ему о своих планах. Мне кажется, эти два афоризма здесь очень подходят. Я делаю сейчас то, что мне нравится, а время покажет.

**Многие твои песни несут в себе очень глубокий оттенок грусти. Ты на самом деле видишь мир в тусклых красках или это своеобразный способ самовыражения?**

У меня был определенный период в жизни, когда было очень тоскливо. Да и вообще, грусть – это неотъемлемая часть нашей жизни. Настроение у человека постоянно меняется, поэтому это нормально. Я пишу песни, когда мне грустно. Хотя по жизни я достаточно жизнерадостный и позитивный человек. Поэтому многие удивляются, как во мне сочетается такая «депрессуха» в песнях и такой позитив в жизни. На самом деле я очень люблю жизнь. И благодарю Бога за каждый прожитый день.

**Ты уже несколько раз упомянула о Боге. Какие у вас с ним отношения?**

Я верю в Бога. Но не отношу себя ни к одной из религиозных конфессий. Бог для меня – такое же необъяснимое понятие, как и любовь. Бог и любовь для меня равносильны. Бог един – и он во всем. В каждом человеке. Во всем, что существует на этой Земле.

**Немного банальный вопрос, но все же - где ты черпаешь вдохновение?**

Первоисточник моего вдохновения – это любовь. Второй – это мое настроение, какие-то жизненные ситуации, происшествия. Реальность, одним словом. Творчество – это, по сути, отражение реальности. Все, что происходит в моей жизни, – отражено в моих песнях.

**Расскажи о своих музыкальных вкусах. На какой музыке ты выросла?**

На хорошей (смеется). Мне всегда очень нравилось слушать именно женский вокал. Если перечислять по именам, первым делом отмечу Бьорк. Она очень интересный персонаж – яркий, эмоциональный, талантливый. Хотя выросла я скорее на творчестве Земфиры, Янки Дягилевой, Маши Макаровой (солистка группы Маши и Медведи – прим. автора), группы КИНО. В свое время мне очень нравились Guano Apes, в классе 10 – 11.

Сейчас очень нравятся Регина Спектор, Алина Орлова. Они играют в похожем стиле, хотя я открыла их для себя около полутора лет назад. Да вообще, много хорошей музыки я открыла для себя относительно недавно. Может потому, что мы живем в провинции, в глубинке… Спасибо интернету, который помогает знакомиться с достойной музыкой. Еще имена? Кэт Пауэр, Пи Джей Харви, Ян Терсен, Флер, Сплин, Тори Эймос, Эми Вайнхаус… Всего не перечислишь.

**У тебя скоро выходит альбом. Расскажи о нем.**

Я записывала его на хорошей студии с хорошими музыкантами. Поэтому, думаю, он будет неплохим. Я говорила про один очень тоскливый период своей жизни. Большинство песен, вошедших в альбом, были написаны именно тогда (2003 – 2005 годы), поэтому альбом будет таким достаточно минорным, меланхоличным. Возможно, он будет не совсем актуальным моему теперешнему настроению, но это часть меня, очень важный и значимый период моей жизни. И я рада, что альбом получился именно таким.

**Что за период? Что-то произошло в твоей жизни?**

Влюбилась я сильно. Об остальном история умалчивает…

**А название у альбома уже есть?**

Над названием пока думаю. Есть несколько вариантов – сложно выбрать что-то одно. Хочется, чтобы и звучало красиво, и содержание альбома отражало.

**Расскажи про свой псевдоним. Что значит PRANA?**

Прана – это понятие, взятое из восточной философии, на санскрите означает “дыхание” или «постоянное движение». Это одно из центральных понятий йоги и традиционной индийской медицины, понимается как жизненная энергия, жизнь.

Прана – это моя душа, тепло, любовь, свет. Иначе говоря – жизнь. С праной, как с Богом, – ты не видишь его, но знаешь, что он есть. Думаю, это не случайно, что псевдоним созвучен с моей фамилией. Ведь фамилия передается от одного поколения к другому и отражается на людях и их жизнедеятельности. В данном случае PRANA – это я и мое творчество.

**Расскажи о своих ближайших планах.**

В ближайшее время выйдет альбом, будет организована его презентация. Мы наконец-то определились с составом музыкантов – у нас чудесный коллектив – так что будем готовить полноценную программу и выступать. В частности, 27 февраля мы дебютировали в электричестве на рок-фестивале X-STAR, затем надеемся сыграть 13 марта на фестивале в Zio Pepe. 27 марта в ГДК «Кирпич» выступаем с акустическим сетом на «Арт-проекте в доме Грибоедова», ну а на 12 апреля запланирован сольный концерт в минском клубе «Граффити».

**Богатая афиша. Сложно «пробивать» концерты?**

В этом смысле мне очень повезло, так как всеми организационными вопросами, касаемо моих творчества и выступлений, занимается Вера Еремова – мой менеджер и лучший друг в одном лице. У нас замечательный тандем. Я пишу песни, занимаюсь вокалом, репетирую, а Вера помогает мне быть услышанной.

**Ну что ж, удачи тебе и вашему коллективу. В добрый путь!**

Спасибо! Приходите на концерты!

P.S. Познакомиться с творчеством Праны можно в интернете на странице:
http://vkontakte.ru/club13089036.

**ВОльга ВОльная**




**Фота: Артур Якуцевіч**

# РАСПРЕДЕЛЕНИЕ: ПЛАКАТЬ ИЛИ СМЕЯТЬСЯ?

**Наверняка каждого студента волнует своя судьба после окончания университета. Большинство студентов-бюджетников мучает вопрос о распределении. Кому оно нужно и как к нему относиться? Вот два мнения сегодняшних студентов-выпускников.**

**Первый опыт самый ценный, и неважно, приобретаешь его в области работы, учебы или других сферах жизни. Первое место работы – это возможность знакомства с новыми людьми, приобретение определенных навыков в области своей профессии, возможность зарекомендовать себя и просто неоценимый опыт в общении.**

Человек, который стал молодым специалистом, по-настоящему взял судьбу в свои руки. Только придя на работу, можно оценить ту беззаботность и легкость, которую несет в себе студенчество. Работа – это не только взросление и ответственность, но и переход на следующий жизненный этап, возникновение новых правил и запретов. То, что раньше было «нельзя» становится доступным, а то, что было можно – не вызывает интереса и прежнего запала. Серьезность и ответственность, приходящие вместе с первым местом работы, вынуждают молодого специалиста не только качественно выполнять свои обязанности, но и не забывать, что они являются, в некотором роде, представителями государственного учреждения, в котором их «всему научили» за недолгие пять лет. Основная причина, по которой молодые специалисты не хотят работать по специальности, – это низкая заработная плата. Но, как сказал один преподаватель нашего университета: «Деньги придут вслед за опытом». Может быть проблема в самих студентах, которые хотят всего и сразу?

Да, безусловно, тяжело стоять в начале этого нелегкого пути, но для того, чтобы достичь чего-то в жизни следует хорошенько потрудиться и... О, какое блаженство собирать плоды своих многолетних трудов! Дорогие, уважаемые студенты, не бойтесь ни распределения, ни первого места работы – просто пытайтесь излучать оптимизм и, я уверена, вы будете получать заряд энергии от окружающих взамен. Любви, удачи и терпения вам…

**Ромашка Н.**

**Распределение – это одно из проявлений того огромного социального зла, которое существует в нашей стране. Ужасные условия существования, неблагополучие – причина, почему пустуют рабочие места в некоторых районах нашей «сильной и процветающей» Родины. Как их заполнить? Заставить работать там насильно!**

Причем система распределения поддерживает «стабильность» социального неблагополучия. Ведь зачем что-то улучшать, если один ссыльный через два года все равно уедет, а на его место направят нового. Работодатель абсолютно не интересуется тем, как удержать работника, – государство все равно обеспечит его кадрами.

Тем более, сейчас эту проблему собираются решать еще эффективней. Вскоре «рекруту» придется терпеть не два года, а пять, а некоторым – даже больше. Так появляется надежда, что бедолага смирится со своим положением, опустит руки и привыкнет к тяжелым условиям (ведь ко всему привыкаешь).

А бывшая студентка, например, поехав в глухую деревушку молодой двадцатитрехлетней девушкой, вряд ли захочет в двадцать восемь лет ехать назад в город искать счастья. Скорее всего, ей придется выйти замуж на месте ссылки и осесть там навсегда. Тем самым она улучшит процентные показатели: можно будет говорить, что теперь все больше молодых специалистов довольны своими рабочими местами, и отток уменьшился. А наше государство станет еще более процветающим.

Хотя, как мне кажется, вместе с этим уменьшится процент заявок на бюджетные места в университет. Но ничего, это тоже можно будет преподнести в позитивном ключе. Можно будет сказать, что у белорусов появилось больше лишних денег, и они не стремятся ради их экономии тратить время на подготовку к экзаменам. И снова же, наша Родина «процветет» еще больше.

**Степан М.**


Фота: photoclub.by

## АДНЫМ РАДКОМ

# КОЛЬКІ КАШТУЕ СТАЦЬ СТУДЭНТАМ?

**Да ЦТ засталося пару месяцаў, і мы вырашылі палічыць, колькі грошай можа быць пушчана «на вецер».**

Пачнем з самай важкай справы – рэпетытарства. Многія мяркуюць, што без гэтага спосабу падрыхтоўкі паступіць у ВНУ амаль немагчыма. Нават калі ў цябе не салома ў галаве… Таму вялікая колькасць бацькоў спраўна адлічвае грошы на рэпетытара, а вучні паслухмяна наведваюць заняткі амаль па ўсіх прадметах.

У сярэднім паслугі рэпетытара каштуюць каля 10 еўра за акадэмічную гадзіну (калі рэпетытар мае вучонае званне або ступень, патрабуецца большая сума; калі гэта звычайны школьны настаўнік – плата складае каля 10 даляраў ). Калі займацца адзін раз на тыдзень, то гэта каля 30-ці заняткаў за вучэбны год, ці каля 300 еўра на аднаго рэпетытара.

Канешне, якім бы вучоным ні быў рэпетытар і як бы добра ён ні выкладаў, усё роўна не абысціся без самападрыхтоўкі. Для гэтага патрэбны падручнікі, розныя дапаможнікі, слоўнікі і спецыяльная літаратура. Каштуе такая бібліятэка значную суму. Кошт за адзін дапаможнік з тэстамі прыкладна Br 10 000, а за падручнік – каля 30 000. Па адным прадмеце патрэбна не менш за 3 падручнікі і 2-3 зборнікі тэстаў. Падсумуем: атрымалася каля 150 тысяч па адной дысцыпліне.

Калі на рэпетытара не хапае грошай, а «падцягнуцца» хочацца, то можна пайсці на падрыхтоўчыя курсы пры ВНУ. Напрыклад, БрДУ прапануе 3-хдзённыя курсы па адным прадмеце, якія ўключаюць кансультацыю па змесце тэставання, парадку яго правядзення, аналіз тэстаў мінулых гадоў, а таксама правядзенне трэніровачнага тэставання. Каштаваць курс па адным прадмеце будзе 42 тыс.

Можна абраць і яшчэ больш танны, але менш выніковы (па меркаванні не толькі вучняў, але і настаўнікаў) варыянт – факультатыўныя заняткі ў школе. Гэта бясплатная форма навучання, аднак тут патрабуецца больш глыбокая самападрыхтоўка, таму на кніжкі пойдзе значна больш грошай.

Для таго, каб адчуць вынікі падрыхтоўкі і мець магчымасць выправіць памылкі яшчэ да ЦТ, можна паспрабаваць свае сілы ў рэпетыцыйным тэсціраванні. За кантроль ведаў па адным прадмеце прыйдзецца выкласці Br 16 100, а калі заказаць індывідуальную кансультацыю з разборам памылак, то яшчэ Br 5 000. У параўнанні з аплатай рэпетытарскіх паслуг – амаль бясплатна.

Падвядзем вынікі: калі аплаціць паслугі двух рэпетытараў, падрыхтоўчыя курсы па адным прадмеце, купіць падручнікі і паўдзельнічаць у трох этапах рэпетыцыйнага тэсціравання, атрымаецца больш за тры з паловай мільёны! І невядома яшчэ, ці здзейсніцца мара атрымаць жаданы студэнцкі білет.

**t-styl.info**



Фота: lublurossiju.ru

# САМЫЕ АБСУРДНЫЕ ВОЙНЫ В ИСТОРИИ

**3270 лет назад, в 1260г. до н. э., если верить Геродоту, началась самая знаменитая война древности — Троянская. Согласно Гомеру, этот конфликт начался с нелепого похищения Елены Прекрасной и закончился еще более нелепой операцией с троянским конем. С тех пор случилось немало вооруженных конфликтов (в том числе и в Беларуси), которые кажутся воплощением глупости и абсурда.**

## АЛКОГОЛЬНЫЙ РАЗГРОМ

Плохое управление, низкий моральный уровень войск и злоупотребление алкоголем еще не раз приводили к печальным последствиям. Пожалуй, самой грандиозной военной катастрофой, порожденной этими причинами, стала битва при Карансебеше, в которой австрийская армия ухитрилась разгромить сама себя.

Беда случилась 17 сентября 1788г. Австрия уже год вела войну с Турцией за контроль над юго-восточной частью Европы. Армия, возглавляемая самим императором Иосифом II, подошла к городу Карансебешу, находящемуся на территории современной Румынии.

Вечером отряд гусар, двигавшийся в авангарде, форсировал реку Тимиш, но вместо предполагаемого османского лагеря обнаружил цыганский табор. У цыган было много шнапса, и гусары пустились в буйное веселье.

Пока кавалеристы наслаждались выпивкой и цыганскими песнями, к табору подошел передовой отряд пехоты. Пехотинцы потребовали поделиться шнапсом, но гусары в грубой форме отказали.

Пехота возмутилась и пригрозила расправой. Тогда гусары заняли оборону за цыганскими кибитками, заявив, что будут стрелять.

История умалчивает о том, кто произвел первый выстрел, нервный пехотинец или пьяный кавалерист, но вскоре завязался бой. Кто-то со страху закричал: «Турки!», и сражавшиеся бросились врассыпную.

Вскоре паника охватила все войско. Австрийская армия состояла из представителей разных народов, которые плохо понимали друг друга. Здесь были немцы, румыны, славяне, итальянцы и многие другие.

Немецкие офицеры пытались остановить свое бегущее воинство криками «Halt! Halt!». Но иноязычным солдатам казалось, что это турки кричат: «Аллах! Аллах!», и паника усиливалась. Кто-то из артиллерийских офицеров увидел конницу, убегающую от несуществующего врага, принял ее за османскую кавалерию и приказал стрелять картечью...

Когда офицерам удалось восстановить порядок, было уже совсем темно, и отличить турок от австрийцев стало совершенно невозможно. Армия приняла бой и доблестно сражалась сама с собой, пока не обратила себя в бегство. В общем смятении Австрия едва не лишилась своего императора, который упал с коня в канаву и чудом остался цел.

Через два дня к Карансебешу подошла османская армия, которая обнаружила поле боя, устланное телами австрийских солдат. Австрийцы потеряли около 10 тыс. человек. Война продолжалась еще три года и, как это ни странно, закончилась победой Австрии.

## ЖЕНЩИНЫ, СТУЛ И ФЛАГШТОК

Пожалуй, самым абсурдным конфликтом эпохи раннего колониализма была гражданская война на острове Питкерн, причем велась она вовсе не за золото и не за земли.

Предыстория той войны хорошо известна из фильма «Мятеж на «Баунти» с Марлоном Брандо в роли главного мятежника Флетчера Кристиана. В 1778г. британское правительство отправило в Тихий океан корабль «Баунти» под командованием капитана Уильяма Блая. Экспедиция должна была собрать на тихоокеанских островах ростки хлебного дерева, которое предполагалось разводить в карибских колониях.

После долгого и трудного плавания моряки оказались на Таити, где вкусили все прелести курортной жизни в объятиях раскрепощенных таитянок. На обратном пути дисциплина начала стремительно падать, и в апреле 1779г. на корабле вспыхнул мятеж, во главе которого стоял первый помощник Флетчер Кристиан. Капитан Блай и верные ему люди были посажены в шлюпку и отправлены в океан, а «Баунти» вернулся на Таити.

Здесь среди мятежников произошел раскол. Большинство собиралось остаться на острове и наслаждаться жизнью, а меньшинство прислушивалось к словам Кристиана, который предсказывал, что однажды на остров явится британский флот и повстанцы попадут на виселицу. Кристиан собрал команду из восьми единомышленников, заманил на «Баунти» шестерых таитян и одиннадцать таитянок и уплыл искать новую родину. Позднее мятежников, оставшихся на Таити, действительно арестовали английские военные, но люди, ушедшие с Кристианом, доплыли до необитаемого острова Питкерн, где и основали свою колонию.

О дальнейших событиях фильм умалчивает. Между тем колонисты какое-то время были вполне довольны жизнью, поскольку даров природы на острове хватало всем. Однако был один «ресурс», запасы которого на Питкерне были весьма ограничены,— женщины. Из-за них-то и началась война.

Когда в 1793г. у одного из мятежников умерла таитянская жена, белые поселенцы не придумали ничего лучше, чем отнять жену у одного из таитян. Тот обиделся и убил нового мужа своей подруги. Мятежники убили мстителя, а оставшиеся таитяне подняли мятеж против самих мятежников.

Кристиан и четверо его людей были убиты таитянами, но на этом война не закончилась. Таитянские жены моряков пошли мстить за убитых мужей и перебили восставших таитян.

В результате войны мужское население острова сократилось до четырех человек, да и те потом постоянно враждовали и ссорились до тех пор, пока один из них не был убит, а другой не умер от пьянства. Зато оставшиеся двое поделили между собой женщин и наслаждались вечным миром, пока один из них не умер от естественных причин. Когда в 1808г. к острову пристал американский корабль, на Питкерне жил единственный мужчина — Джон Адамс, у которого было девять жен и около сорока детей!

## АМЕРИКАНО-НЕМЕЦКАЯ НИЧЬЯ

В конце XIX века великие державы стремились завоевать любые территории, даже пустынные, заболоченные или покрытые непроходимыми джунглями, не имея никакой гарантии, что в этих местах обнаружатся хоть какие-нибудь ценные ресурсы, что само по себе было достаточно абсурдно. Но порой люди, напрямую участвовавшие в территориальных конфликтах, поступали столь безрассудно, что современники не знали, что и сказать. Так, инцидент, произошедший в 1899г. у берегов Самоа, был назван мыслительной ошибкой, которая вовеки пребудет парадоксом человеческой психологии.

В конце XIX века Германия и США претендовали на контроль над островами Тихого океана, причем особый интерес у обеих держав вызывал архипелаг Самоа. Верные принципам «дипломатии канонерок», Берлин и Вашингтон отправили к островам свои эскадры, которые и встретились в гавани столицы Самоа — Апиа. В обеих эскадрах было по три боевых корабля и по несколько кораблей снабжения, так что в бухте было довольно тесно.

15 марта 1889г. на обеих эскадрах заметили приближение страшного тропического циклона. Любой корабль, который остался бы в гавани, неминуемо был бы разбит о скалы. Единственным спасением был немедленный выход в открытое море.

Но ни германский, ни американский адмиралы не могли решиться первым отойти от берега. Покинуть гавань первым означало признать свое поражение, и потому обе эскадры стояли в порту, пока не налетел тайфун. Результаты оказались более чем плачевными. Из судов, находившихся в бухте, уцелели лишь один американский и один немецкий корабль, да и их пришлось снимать с рифов и ремонтировать. Число жертв исчислялось сотнями.

Впрочем, если бы эскадры все-таки открыли огонь, жертв возможной германо-американской войны было бы значительно больше. А так противостояние США и Германии кончилось тем, что острова просто поделили.

## КАК ИДИ АМИН «ПОБЕДИЛ» США

За эпохой мировых войн последовало крушение колониальной системы, и европейцы, прекратив делить мир, перестали воевать друг с другом. Но молодые государства, возникшие на руинах колониальных империй, были готовы воевать за место под тропическим солнцем.

Некоторые из конфликтов народившегося третьего мира были порождением больного воображения новоявленных диктаторов. Так, знаменитый правитель Уганды Иди Амин однажды объявил войну США, а поскольку Вашингтон никак на это не реагировал, на следующий день провозгласил себя победителем.

В 1978г. «повелителю всех тварей земных и рыб морских» пришло в голову начать настоящую войну с соседней Танзанией, которая была безнадежно проиграна, после чего диктатор-людоед удалился в изгнание.

## САЛЬВАДОР—ГОНДУРАС 3:0

Однако большинство войн второй половины XX века все же имели под собой экономическую основу. Это относится даже к самому нелепому конфликту прошедшего столетия, известному как «футбольная война».

К концу 1960-х гг. отношения между Сальвадором и Гондурасом резко обострились. Обе страны были членами организации Центральноамериканского общего рынка. Согласно правилам этой организации, более развитый экономически Сальвадор имел некоторые торговые привилегии, что очень не нравилось Гондурасу.

Между тем сальвадорские крестьяне страдали от малоземелья и тысячами переселялись в Гондурас, где незаконно захватывали пустующие земли. К 1967г. в Гондурасе проживало около 300 тыс. сальвадорских мигрантов, многие из них занимались торговлей и активно вытесняли гондурасцев из бизнеса.

В конце концов власти Гондураса не выдержали и стали активно выселять сальвадорцев на историческую родину, что сопровождалось массовыми притеснениями трудовых мигрантов. В ответ в Сальвадоре поднялась волна антигондурасских настроений. Военные режимы обеих стран жаждали укрепить свое положение, так что патриотический угар был весьма кстати для властей по обе стороны границы.

**(Заканчэнне на с. 8)**

# ГЕРОЙ ДВУХ КАНТЫНЕНТАЎ

**4 лютага ў Марачоўшчыну каля Косава з'ехалася некалькі дзесяткаў чалавек, каб узяць удзел у адзначэнні 264-х угодкаў Тадэвуша Касцюшкі.**

У цырымоніі прынялі ўдзел часовы павераны ў справах ЗША ў Беларусі Майкл Скэнлэн, генеральны консул Польшчы ў Берасці Яраслаў Ксёнжэк, саветнік пасольства Швейцарыі Дзітрых Драер, высокія чыноўнікі Берасцейскай вобласці.

Прысутнічалі і прадстаўнікі дэмакратычнай супольнасці – палітыкі, дзеячы культуры, гісторыкі. Традыцыйна завітала і нямала мясцовых жыхароў, а таксама госці з Івацэвічаў, Бярозы, Баранавічаў, Берасця і іншых мясцін.

Да камня з мемарыяльнай шыльдай каля сядзібы Тадэвуша Касцюшкі дэлегацыі ўсклалі вянкі і кветкі. Афіцыйныя госці накіраваліся ў сядзібу-музей, на экскурсію з праглядам дакументальнага фільма. Таксама яны пазнаёміліся з выставай паштовых марак розных краін, прысвечаных Касцюшку і яго часу.

– Касцюшка – гэта частка нашай сумеснай гісторыі, гэта чалавек, які змагаўся за свабоду і быў увасабленнем лозунга "свабода, роўнасць, братэрства", – адзначаў у сваім выступе генеральны консул Яраслаў Ксёнжэк, – ён належыць усяму свету, але нарадзіўся ў гэтым месцы, таму вялікі гонар пабываць тут.

Госці прэзентавалі музею падарункі, сярод якіх былі кнігі, малюнкі і манеты часоў Касцюшкі.

Каля мемарыяльнага камня выступіў старшыня Партыі БНФ Аляксей Янукевіч, бард Зміцер Бартосік праспяваў некалькі патрыятычных песень, а пісьменнік Уладзімір Арлоў у сваім выступе падкрэсліў:

- Няма ніякага сумневу, што Касцюшка — нацыянальны герой Беларусі. Такім яго ўжо даўно лічыць патрыятычнае беларускае грамадства.

Пасля ўшанавання памяці Касцюшкі прадстаўнікі грамадскасці накіраваліся на каталіцкія могілкі каля Косава, дзе ў 1928г. польскімі ўладамі быў усталяваны трохметровы крыж-помнік у гонар іншых паўстанцаў – касінераў Кастуся Каліноўскага. 2 лютага адзначаліся ўгодкі пачатку паўстання 1863-1864гг. на Беларусі. А на могілках у Косаве пахаваныя паўстанцы, сярод якіх вядомыя прозвішчы Лукашэвіча і Красінскага.

Пасля ўскладання кветак мясцовыя краязнаўцы распавялі пра падзеі паўстання 1863г. на Косаўшчыне і ў бліжэйшых рэгіёнах.

Нехта з удзельнікаў урачыстасці адзначыў, што Каліноўскага на афіцыйным узроўні так не ўшаноўваюць таму, што ён не з'яўляецца амерыканскім нацыянальным героем. Гэтую думку складана было аспрэчыць, але дэмакратычная грамадскасць згадзілася з тым, што нельга ацаніць каштоўнасць незалежнай дзяржаўнасці без асэнсавання тых подзвігаў, што здзейснілі і Касцюшка і Каліноўскі дзеля яе здабыцця.



Прадстаўнікі Партыі БНФ і Руху "За Свабоду" на ўрачыстасцях у Косаве

### КАСЦЮШКА. ГЕРОЙ І ЧАЛАВЕК

**У нашай свядомасці жыве вобраз Касцюшкі-змагара, барацьбіта за незалежнасць. Аднак мала хто ведае, якія падзеі падштурхнулі маладога героя да выезду спачатку ў Францыю, а потым і на далёкі кантынент – у Амерыку.**

Скончыўшы Парыжскую Акадэмію, у 1775 г. Тадэвуш вяртаецца на Радзіму. Аднак ягоныя ўменні ў вайсковай справе аказаліся тут нікому не патрэбныя. Вакантнага месца ў войску не было.

Каб неяк стачыць канцы, будучы генерал наняўся настаўнікам малявання і французскай мовы да дачкі ваяводы Сасноўскага Людвісі, якая мела 19 гадоў. Тадэвушу на той момант было 27. Маладзёны закахаліся і ўжо не ўяўлялі жыцця паасобку. Аднак бедны настаўнік быў не лепшым зяцем у вачах ваяводы. Сасноўскі катэгарычна заявіў Тадэвушу, што дачка панская не для дробнага шляхціча.

Страціць каханую Тадэвуш не мог, таму склаў план, як скрасці Людвісю і вянчацца з ёю без згоды гетмана. Ён паклікаў сяброў і выкраў паненку. Але ж падобныя аванцюры, на жаль, часцяком канчаюцца крахам: харугва гайдукоў напала на картэж і адбіла Людвісю. Касцюшка мусіў хавацца, уцякаць за мяжу, бо за такія ўчынкі ў тыя часы маглі пакараць смерцю.

Не доўга думаючы, Касцюшка вяртаецца ў Францыю, дзе ў яго засталося шмат сяброў. У той час амерыканскія штаты ваявалі з Англіяй за незалежнасць. Францыя, як адвечны вораг "туманнага Альбіёну", падтрымлівала амерыканцаў. Нягледзячы на тое, што на акіянскіх прасторах Атлантыкі дзейнічалі бязлітасныя ангельскія карсары, у 1776г. Касцюшка сышоў на амерыканскую зямлю. Толькі тут сын зямлі беларускай пабачыў тое, што не магло яму нават прысніцца на радзіме: вольных людзей, якія ўпершыню ў гісторыі стварылі дзяржаву без саслоўяў. Гэтай вайне за свабоду і роўнасць людзей Тадэвуш аддаў 7 гадоў жыцця.

**Алесь ЖОЛУД**

# БРУДНА ЛАЯЦЦА, СТРАЦІЎШЫ РАЎНАВАГУ

**Як звычайна, кароткая казань перад тым, як пачаць даваць прыклады няправільнага ўжывання слоў.**

Чаму трэба старацца ўжываць чыстую беларускую мову? Не будучы дыялектам ніякай іншай, наша мова жыве паводле сваіх уласных законаў, як асобны арганізм. Калі ж мы ператвараем сваё асабістае маўленне ў суцэльную кальку, то мы фактычна моўнай практыкай абвяргаем гэты тэзіс. Якая ж тады беларуская мова "асобная"? Як жа яна "жыве як асобны арганізм", калі выходзіць, што мы проста падстаўляем на месца расейскіх слоў беларускія, робячы калькі? Пазбягайма гэтага. Пачынайма вучыцца думаць адразу па-беларуску, без іншых моў-пасярэдніц.

Шмат хто з вас, едучы ў грамадскім транспарце чуў, як прыемны мужчынскі голас раіць пасажырам: "Каб не **згубіць раўнавагу** і не ўпасці, трымайцеся за поручні". Той, хто склаў гэты тэкст відавочна думаў па-расейску. Па-расейску правільна будзе сказаць "потерять равновесие", але расейскае "терять" пабеларуску можа перакладацца як "губляць" і як "траціць". "Губляюць" нешта канкрэтнае. Напрыклад, ключы. А "трацяць" – абстрактнае. Трацяць прытомнасць, трацяць раўнавагу. Дык правільна было б сказаць "страціць раўнавагу". Гэта можна было б знайсці ў слоўніках, але "нашы людзі" слоўнікаў відавочна не любяць.

Нельга "**сварыцца матам**", можна "лаяцца". Сварка – гэта канфлікт між людзьмі. Частка гэтага канфлікту можа быць "лаянка" – выражэнне варожасці ў словах. Дзеля гэтага кажуць "брудная лаянка", калі гэтыя словы надта ўжо нехарошыя, але не ўжываюць "брудная сварка". Тут зноў думанне па-расейску стварае праблемы, бо па-расейску і "лаяцца" – "ругаться", і "сварыцца" – "ругаться". Ну бедная ў іх мова, што тут парадзіш. :)

Няма і слова "**абдрукоўка**" ў беларускай

## ТЭЗАЎРУС

літаратурнай мове. Далібог, няма. Гэта прыклад калькі: о-печат-ка – аб-друкоў-ка. Па-беларуску правільна – "памылка друку".

"**Спіца**" ў беларускай мове – гэта не тое, чым робяць, напрыклад, панчохі. Такія прылады па-беларуску завуцца "пруткі". Не канечне імі можна "вязаць", можна проста "рабіць": "Узяла пруткі, каб рабіць шкарпэткі".

Ёсць два дзеясловы «**надзяваць**» і «**апранаць**». Апранаюць світку, кажух, бурнос. Гэта значыць, «верхняе адзенне», вопратку. Таму, напрыклад, трусы «апранаць» нельга.

У беларускай літаратурнай мове ёсць словы «**гандляваць**» (займацца гандлем), і «**таргаваць**» (дамаўляцца аб цане) («Я ўчора на таргу пабываў, я ж табе вяночак старгаваў»). Таму «за кожны рубель» таргуюцца а не «гандлююцца».

**Юрка АГІЕВІЧ**

# А ЦІ БЫЎ ТОЙ ЛЕЎ?



Такім будзе Касаўскі палац пасля рэканструкцыі

## ЛЕГЕНДЫ КОСАЎСКАГА ПАЛАЦА

**У гісторыі замкаў і палацаў заўжды ёсць легенды, таямніцы, якія і прыцягваюць цікавасць турыстаў да такіх мясцін. Косаўскі палац не з'яўляецца выключэннем.**

Трэба адзначыць, што ў розных краінах і легенды вакол замкаў і палацаў з'яўляюцца розныя. Так, для Англіі вельмі характэрныя легенды пра прывідаў, якія па начах бадзяюцца па палацах. Англійскім замкам нават непрыстойна не мець уласных прывідаў, з-за чаго іх вельмі часта прыдумляюць. І не дзіва! Які ж англійскі турыст пойдзе ў замак без прывіда? Гэта ж зусім нецікава...

У Чэхіі ёсць легенда пра коннага тампліера без галавы, які з'яўляецца на вуліцах Прагі, у Румыніі – пра усім вядомы замак Дракулы.

Беларускія замкі і палацы таксама маюць сваіх прывідаў. Яшчэ Уладзімір Караткевіч пісаў пра прывідаў Белай Дамы і Чорнага Манаха ў Гальшанскім замку. У Лошыцкай сядзібе прывід пані Любанскай дапамагае маладым у справах амурных. У Нясвіжскім замку па начах ходзіць дух Барбары Радзівіл, жонкі караля Рэчы Паспалітай Жыгімонта Аўгуста.

Шмат легендаў мае і даволі малады Косаўскі палац.

Дарэчы, многія людзі памылкова называюць Косаўскі палац замкам. Але ён не нясе ў сабе абарончых функцый, таму з'яўляецца ўсё ж палацам. Хаця сваімі дэкаратыўнымі зубцамі ён можа і нагадвае замак. Але гэтыя, на першы погляд абарончыя, рысы маюць толькі дэкаратыўны характар.

**ПАДЗЕМНЫ ХОД**

Самая папулярная легенда распавядае пра падземны ход даўжынёй 25 кіламетраў ад Косаўскага палаца да Ружанскага.

Сапраўды, непадалёку ад цэнтральнага ўваходу ёсць падземная "пячора", засыпаная зямлёй. Куды яна вядзе – невядома, але дакладна не да Ружанаў. Гэтая легенда – звычайная выдумка, бо такі тунэль вельмі складана было б зрабіць (як там было б, напрыклад, з вентыляцыяй?), ды ён тут і непатрэбны быў. Падземныя хады з замкаў рабіліся для адступлення падчас аблогі і былі яны, як правіла, 100-700 метраў. Нагадаем яшчэ раз, што палац Пуслоўскіх не планавалася выкарыстоўваць у ваенных, абарончых функцыях.

**АКВАРЫУМ ПАД ПАДЛОГАЙ**

Паводле другой легенды, у палацы было каля 100 пакояў. Пры гэтым усе яны адрозніваліся адзін ад аднаго. Былі "блакітны пакой", "залаты пакой", "срэбны пакой", "шкляны пакой"...

Гэтая легенда магла б быць праўдай, тым больш трэба ўлічыць тое, што Пуслоўскія былі надзвычай багатымі людзьмі. Ды і не рабілі ж бы яны ўсе пакоі аднолькавымі, як у студэнцкім інтэрнаце.

Толькі вось наконт пакоя, у якім падлога была шкляной, а пад гэтым шклом плавалі рыбкі, можна быць крышку больш скептычным...



Праект інтэр'ера аднаго з пакояў Косаўскага палаца

**ГЛЯНЕ СОНЦА І Ў ГЭТА ВАКОНЦА**

Кажуць, што Косаўскі палац пабудаваны такім чынам, што кожны год пару дзён сонца свяціла ў пэўны пакой, а потым пераходзіла ў іншы.

Даволі неверагодная версія, якую складана было праверыць, пакуль у палацы не было пакояў. Але пасля завяршэння рэстаўрацыі палаца мы абавязкова вопытным шляхам гэта праверым, галоўнае, каб за час рэстаўрацыі вокны на сваіх месцах засталіся.

**ЦІХА! ТУТ АКУСТЫКА!**

Іншая легеда сцвярджае, што палац быў збудаваны так, што ў ім была неверагодная акустыка. Пляснеш у далоні ў адным канцы палаца – а звон пойдзе да іншага.

Тое, што акустыка палаца была лепшай, чым у сялянскай хаце – гэта факт, бо пакоі былі вялікія і з высокай столлю. Але ж наконт такой гіперакустыкі можна сумнявацца.

Хіба што ў сцены былі умураваны акустычныя збаны, як ў Каложскай царкве. Тады акустыка была б яшчэ лепшай. Але нават у гэтым выпадку, наўрад ці па ўсім палацы быў чуваць звон ад пляскання ў далоні.

Ды і навошта была такая акустыка? А калі ў пана кніжка са стала ўпадзе, гэта ж які грукат будзе ў палацы! Нібы цягнік прайшоў...

**БЯЗЗУБЫ ЛЕЎ?**

Яшчэ адна легенда кажа, што ў Пуслоўскіх у палацы быў леў, якога яны выпускалі гуляць па калідорах, каб слугі нічога каштоўнага ў палацы не скралі. Улічваючы тое, што ў парку Пуслоўскіх былі ўнікальныя дрэвы з самых розных экзатычных краін, то мог быць у іх і леў.

Але выпускаць льва гуляць па калідорах – гэта глупства. Вы паглядзіце што з вашай мэбляй можа зрабіць звычайны коцік, які вострыць свае кіпці. А калі б аб якую-небудзь канапу Пуслоўскіх павастрыў свае «нажы» леў, як бы яна выглядала? Нават калі б кіпці льву абрэзалі, ён бы і зубы час ад часу вастрыў бы аб столік з чырвонага дрэва... Хіба што леў быў зусім стары, нямоглы, без кіпцяў і зубоў...

А наконт таго, што слугі маглі красці, то варта адзначыць, што навошта ім было гэта рабіць, жывучы ў такіх шыкоўных умовах – каб іх саслалі ў якую вёсачку зямлю ўрабляць? Я думаю, што слугі даражылі сваім даволі высокім статусам.

**НА САНЯХ ПА СОЛІ**

Кажуць, што графіня Пуслоўская вельмі любіла катацца на санях. Жадаючы дагадзіць каханай жонцы, граф ладзіў катанні нават летам. Тэрасы парка засціλаліся белымі тканінамі і пасыпаліся соллю, па якой графіня і каталася на санях.

Гучыць даволі праўдападобна. Чаго не зробіш дзеля каханай жонкі, тым больш маючы мора грошай! А жонка ж потым іншым дамам пахваліцца тым, што яе муж гатовы для яе ўсё зрабіць, нават зіму летам. Тут і графу залік, бо ўсе ж ягонай жонцы зайздросціць будуць!

**ЗОЛАТА ПАРТЫІ?**

Самая апошняя легенда, якую распавядаюць мясцовыя жыхары, кажа, што гадоў 20 таму нейкія турысты знайшлі ў палацы больш за 100 кілаграмаў золата.

Вельмі сумнеўная легенда. Справа ў тым, што апошнія ўладальнікі палаца выграблі адсюль усе каштоўнасці і вывезлі іх у Расею. А пасля іх тут былі палякі, немцы, партызаны, мясцовыя жыхары. Наўрад ці пасля іх тут нешта магло застацца. Падчас апошніх раскопак у 2008г. археолагі радаваліся тут кожнаму цвіку, а на золата яны нават і спадзяванняў не мелі.

Калі мясцовыя фантазіі прыняць за рэчаіснасць, і палічыць, што 20 гадоў таму тут золата сапраўды адкапалі, то ўзнікае пытанне, а чыё ж гэта было золата? Можа гэта было золата камуністычнай партыі, якая закапала яго ў палацы, калі пачалася агонія Савецкага Саюза?

Дык вось дзе яно было, золата партыі! :)

Як бы там ні было, усе гэтыя легенды – вялікае культурнае багацце нашага краю. Ад іх нельга адмаўляцца, а трэба берагчы, пераказваць, прыдумляць новыя. Тады і турысты сюды пацягнуцца з усяго свету, і нам будзе што расказаць сваім дзецям падчас экскурсіі да палаца Пуслоўскіх.

**Павел ДАЙЛІД**

# 14 ЛЮТАГА – НОВЫ ГОД. У КІТАІ

**14 лютага Кітай святкаваў не Дзень закаханых, а Новы год. Для кітайцаў такое супадзенне з'яўляецца зусім недарэчным, бо бягучы год яны называюць "годам удоў" і вераць, што ў гэтым годзе жанчынам не пашчасціць з пошукам сваёй палавінкі. Больш за тое, 2010 год нясе за сабой пагрозы распаду шлюбаў і нараджэння нешчаслівых дзяцей.**



Нягледзячы на XXI стагоддзе, кітайцы засталіся вельмі прымхлівай нацыяй, усе забабоны тут маюць шматвяковую гісторыю і асабліва яскрава выяўляюцца на Новы год.

Напрыклад, сустракаць Новы год трэба ў чырвоным, гэты колер для іх – самы ўлюбёны. Існуе легенда, што зусім даўно жыла-была пачвара, што выпаўзала са сваёй нары акурат пад Новы год.Кожны раз яна з'ядала каго-небудзь з жыхароў вёскі, пакуль там не засталася адна сям'я, якая апранулася толькі ў чырвоны колер. Так людзі зрабілі выснову, што адзінае, чаго баялася пачвара – гэта чырвоны колер.

Яшчэ адзін цікавы факт: традыцыя запальвання петардаў і феерверкаў пайшла менавіта з Кітая. Прычым мы наўрад ці калі-небудзь зможам параўняцца ў гэтай справе з Паднябеснай. Святкаванні старонняму чалавеку могуць падацца ваеннымі дзеяннямі, выходзіць на вуліцу проста страшна. Справа ў тым, што кітайцы вераць, што напярэдадні Новага году злыя духі, выгнаныя са сваіх месцаў, шукаюць сабе прытулку. Звычайна яны селяцца ў нейкую хату і робяць гаспадарам розныя шкоды. Дык вось, каб адагнаць нячысцікаў да суседзяў, кітайцы робяць як мага болей грукату. З вынаходніцтвам пораху гэта стала значна прасцей.

Новы 2010 год пройдзе пад знакам загадкавага і непераможнага белага і жоўтага металічнага Тыгра. Са старажытных часоў гэтага звера шануюць ва ўсім свеце. Тыгр - гэта знак справядлівасці, мудрасці, адвагі, вайсковай доблесці, нястрымнай сілы і запалу.

З такой нагоды кітайскія заапаркі распачалі досыць прыбытковы бізнэс: наведвальнікам прапануюць набыць тыгровыя вусы коштам 5-15$ у залежнасці ад даўжыні. Паводле слоў прадаўцоў валоданне тыгровым вусам дапаможа пазбегнуць усялякіх непрыемнасцяў у будучым годзе. Попыт на такі сувенір перавышае прапанову. У заапарках запэўніваюць, што ўсе вусы тыгры страцілі натуральным шляхам і ніхто са звяроў не пацярпеў.

Будучы год, як ужо адзначалася, асаблівы – гэта год Металічнага Тыгра, які належыць да Стыхіі Металу, ягоным талісманам з'яўляецца срэбра і серабрысты або металічны колер.

Кітайцы раяць выкарыстоўваць розныя металічныя аздобы: металічныя кольцы, каралі, бранзалеты, завушніцы з золата, срэбра, медзі і плаціны (але не больш за два розныя металы).

У вопратцы перавага аддаецца беламу і жоўтаму колеру, падыдуць аздобы з натуральных матэрыялаў: скуры, мяху, бавоўны і інш.

Яшчэ адной традыцыяй, без якой Новы год у Кітаі не Новы год, з'яўляюцца парныя надпісы, якія ўпрыгожваюць уваход у кожны дом. Адзін надпіс часцей за ўсё складаецца з 4 іерогліфаў. Гістарычна яны ўзыходзяць да замоў на персікавых дошчачках, што мацаваліся на дзвярах напярэдадні Новага года. Персікаваму дрэву спрадвеку прыпісвалі ўласцівасць абараняць жыллё ад усялякай пошасці. З цягам часу такія надпісы страцілі сувязь з магічнымі замовамі і ператварыліся ў звычайныя пажаданні шчасця і дабрабыту.

Усе стравы і пачастункі да Навагодняга стала рыхтуюцца загадзя, бо ў святочныя дні забараняецца карыстацца ўсімі вострымі прадметамі. Лічыцца, што можна адрэзаць шчасце будучага года. Усе нажы, нажніцы і г.д . заварочваюцца ў чырвоную паперу і хаваюцца прэч ад вачэй.

**Алесь ЖОЛУД**

# САМЫЕ АБСУРДНЫЕ ВОЙНЫ В ИСТОРИИ

**(Заканчэнне. Пачатак на с. 5)**

В 1969г. начались стыковые матчи за путевки на чемпионат мира по футболу 1970г., и командам Сальвадора и Гондураса предстояло померяться силами. Первый матч выиграли гондурасцы со счетом 1:0, после чего одна сальвадорская болельщица и патриотка застрелилась, не вынеся национального позора.

Второй матч выиграли сальвадорцы со счетом 3:0, после чего сальвадорцы бросились избивать вражеских болельщиков и жечь гондурасские флаги.

Третий матч окончился со счетом 3:2 в пользу Сальвадора, после чего гондурасцы избили двух сальвадорских вице-консулов и пошли громить еще не выгнанных нелегалов, а гондурасское правительство разорвало отношения с вероятным противником.

14 июля Сальвадор двинул на Гондурас войска. Война продолжалась шесть дней и закончилась победой Сальвадора. Гондурас был вынужден платить компенсации ограбленным иммигрантам, но зато Сальвадор лишился своих торговых преимуществ и вообще всей своей торговли с Гондурасом.

После этой войны обе страны ожидала долгая полоса экономических и политических неурядиц. Зато обе военные хунты на волне патриотических настроений заметно упрочили свою власть.

**ПОЛОЦКАЯ "ЕЛЕНА ПРЕКРАСНАЯ"**

Вышеприведённые факты, опубликованные в «Коммерсантъ-Деньги», «Салідарнасць» решила дополнить случаями из белорусской истории, когда войны начинались из-за абсурдных поводов. Была у нас и своя Елена Прекрасная, которая спровоцировала военный поход на наши земли. И звали ее Рогнеда.

Эта история известна всем еще со школьных учебников и подробно описана в «Повести временных лет». К Рогнеде, дочери полоцкого князя Рогволода, посватались сразу два брата — Ярополк, который княжил в Киеве, и Владимир, которому принадлежал Новгород. Братья враждовали между собой и таким образом хотели заручиться поддержкой полоцкого князя.

Выбор княжны пал на Ярополка. «Не хочю розути робичича, но Ярополка хочю», — заявила Рогнеда, намекая на происхождение Владимира, который был незаконнорожденным сыном князя Святослава Игоревича и его наложницы Малуши Любечанки, ключницы княгини Ольги. Владимир Красное Солнышко отказа девушки не стерпел. Собрал войска и пошел на Полоцк. Он убил отца, мать и двух братьев Рогнеды, а над самой княжной надругался на глазах тогда еще живых родителей.

Княжну Владимир взял потом в жены, о чем явно пожалел. Однажды Рогнеда чуть было не зарезала спящего мужа, но внезапно проснувшись, тот успел схватить ее за руку. Если бы не заступничество маленького сына Изяслава, который встал с мечом на защиту матери, судьба полоцкой княжны была бы предрешена. За этот проступок Рогнеду и ее сына Владимир отправил в ссылку в глухое место у истоков Свислочи, где сейчас находится город Заславль.

**КАК «ОШИБКА» В ДОКУМЕНТЕ УМЕНЬШИЛА НАСЕЛЕНИЕ БЕЛАРУСИ ВДВОЕ**

Самым кровопролитным военным конфликтом по праву может считаться война России с Речью Посполитой 1654-1667 гг., в результате которой население Беларуси уменьшилось в два (!) раза. Мало кто знает, что для развязывания этой войны был выбран абсолютно абсурдный повод — неточность в официальном документе. В частности, в написании царского титула.

Московские послы, приехавшие летом 1653г. в Речь Посполитую напирали на то, что подкормчий Петр Вяжевич пропустил в обращении к царю Алексею Михайловичу определение «повелителя всея Руси». Царские переговорщики требовали «над виноватым в умалении государева титула… справедливость учинить перед ними же». В пример даже приводился персидский шах, который прислал таких же забывчивых в Москву царю для наказания.

Заметим, что даже при желании перечислить все регалии российского государя было чрезвычайно сложно. Польский мемуарист Ян Пасак, удивленный количеством титулов и необходимостью их знать наизусть, отмечал, что в Москве замечают принижение имени царского быстрее, чем имени Божьего.

Шляхта не последовала примеру персидского шаха. И по возвращении послов в Москву Земский собор в октябре 1653г. постановил: «За честь царей Михаила и Алексея стоять и против польского короля войну вести, а терпеть того больше нельзя».

В итоге в июне 1654г. была развязана война, в результате которой население Беларуси сократилось с 2,9 млн. человек до 1,4 млн.

Понятно, что забывчивость писаря стала лишь формальным поводом для объявления войны. Еще задолго до роковой ошибки Россия готовилась к наступлению: уже в марте 1653г. патриарх Никон благословил царя на этот поход, и войска лишь ждали команды. Однако царская знать все-таки могла проявить большую смекалку и придумать для войны повод посерьезнее.

**GAZETABY.COM**

# НАВОШТА НАМ БАЛОНЬЯ?



**У 2010г. Беларусь падпіша Балонскую канвенцыю. Пра гэта заявіў намеснік начальніка Ўпраўлення вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі Мінадукацыі Эдуард Шаўцоў: “Летась на пасяджэнні рэспубліканскага савета рэктараў вну рэктары вырашылі, што яны гатовы да дзейнасці з улікам Балонскіх ініцыятыў. Гэта значыць, што Беларусь можа далучыцца да Балонскага працэса. Магчымы тэрмін далучэння — гэты год, 2010-ы”.**

Самым галоўным у далучэнні Беларусі да Балонскай канвенцыі чыноўнік лічыць тое, што дыпломы нашых ВНУ будуць прызнавацца ва ўсім свеце. Гэта вельмі важна для замежнікаў, якія вучацца ў нашай краіне.

Але ці толькі замежнікам патрэбна новая адукацыйная мадэль?

### ШТО ТАКОЕ БАЛОНСКІ ПРАЦЭС?

Збольшага, гэта адзін з бакоў агульнай глабалізацыі. Ён накіраваны на стварэнне адзінай адукацыйнай прасторы ў Еўропе, на выпрацоўку адзіных прынцыпаў і стандартаў адукацыі. Гэта спрыяе павышэнню якасці адукацыі, бо дазваляе аб’ядналь вопыт выкладчыкаў розных краін Еўропы і заахвоціць універсітэты да ўдзелу ў сусветных навуковых даследаваннях і дыскусіях.

Сёння Балонская канвенцыя аб’ядноўвае 46 краінаў.

Ад краін-удзельніц патрабуецца працаваць адпаведна асноўным прынцыпам сістэмы, галоўны з якіх – арыентацыя на самастойную працу студэнта. Вітаецца асабістая адказнасць кожнага чалавека за змест і якасць ягонай адукацыі. Студэнт сам абірае ўніверсітэты, у якіх будзе вучыцца, а таксама дысцыпліны, выкладчыкаў, час навучання і г.д.

У Еўропе прынята сістэма трох ступеняў: бакалаўрыят, разлічаны на 3-4 гады, і пасля – магістратура – на адзін-два гады. Бакалаўрыят рыхтуе спецыялістаў-прафесіяналаў. Яны вывучаюць канкрэтна тое, што спатрэбіцца ім на працы. Магістратура ж дазваляе пашырыць свой культурны і агульнаадукацыйны ўзровень. На трэцяй ступені – аспірантуры – найбольш здольныя займаюцца навукай, распрацоўкай інавацыйных тэхналогій.

Гэта дазваляе значна эканоміць час і сродкі. Навошта чалавеку, які будзе працаваць па стандартнай праграме на заводзе вучыцца 5 год? Ён усе роўна не зможа прымяніць атрыманыя веды на практыцы і хутка іх забудзе. На той выпадак, калі ён захоча займацца распрацоўкай новых тэхналогій ці ўвогуле змяніць прафесію, то ў любы момант жыцця можа працягнуць навучанне.

Такім чынам, другім найважнейшым прынцыпам балонскай сістэмы з’яўляецца навучанне на працягу ўсяго жыцця.

Прычым вучыцца ты можаш у любым універсітэце і мяняць іх хоць кожны семестр. Для гэтага выпрацаваная сістэма “крэдытаў” – аб’ём ведаў і навыкаў, якімі студэнт мусіць авалодаць за пэўны тэрмін.

Больш за тое, зараз у шмат якіх універсітэтах уводзіцца сістэма прызнання кваліфікацый, якія чалавек набыў па-за ўніверсітэцкімі сценамі. Дастаткова будзе проста ацаніць ягоныя веды і ўменні. І тады прадметы, якія вядуць да іх атрымання, ён можа не наведваць.

### ЦІ ПРЫЗНАЕ БЕЛАРУСЬ ОКСФАРДЦА?

Зараз Беларусь з’яўляецца адзінай краінай Еўропы, якая не далучылася да Балонскага працэсу.

Цікава, што яшчэ ў 1999г. кіраўніцтва БДУ прапаноўвала распрацаваць праграму па далучэнні да Балонскай дэкларацыі. У 2003г. была пастанова Савета Міністраў аб пераходзе на балонскую мадэль адукацыі. І закон аб адукацыі быў адрэдагаваны пад гэта. Праводзіўся эксперымент па ўвядзенні двухступеньчатай мадэлі вышэйшай адукацыі (бакалаўр-магістр). Беларусь рухалася ў гэтым накірунку досыць паслядоўна, але ў 2004 годзе была пастаўленая кропка.

Палітыка адукацыі ў Беларусі змянілася, арыенціры сталі цалкам іншыя: не на інтэграцыю ў еўрапейскую прастору, а на ізаляцыю. І сёння Беларусь, натуральна, далей ад Балонскага працэсу, чым яна была ў 2004г.

Але нарэшце ўлады зразумелі, што з савецкай мадэллю адукацыі ў сучасным свеце існаваць цяжка. У 2007г. была прынятая праграма экспарту адукацыйных паслуг. Меркавалася, што паводле гэтай праграмы Беларусь зможа прыцягнуць замежных студэнтаў з краінаў Азіі і атрымаць за кошт гэтага досыць заўважнае павелічэнне свайго бюджэту. Але прыцягнуць замежных студэнтаў у сістэму, якая па сутнасці ізалюе сябе ад астатняга свету, нерэальна. Планы не былі выкананыя, бо беларуская адукацыя вельмі нізка ацэньваецца ў свеце (акрамя сферы IT-тэхналогій). У 2002-2003гг. Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт спрабаваў ацаніць, наколькі вышэйшая адукацыя ў Беларусі спрыяе інавацыйнаму развіццю беларускай прамысловасці. Атрымалася, што большасць нашых тэхнічных ВНУ рыхтуюць спецыялістаў учорашняга дня. Яны абсалютна не арыентаваныя на інавацыйныя тэхналогіі. Больш за тое, Беларусь не хоча прызнаваць дыпломы ці ступені, атрыманыя ў іншых краінах (у Беларусі не прызнаецца нават дыплом з Оксфарда). Таму лагічна, што і беларускія дыпломы не будуць прызнавацца за мяжой.

### НЯЎЖО СІТУАЦЫЯ ЗМЕНІЦЦА?

Праблема ў тым, што беларускія ўлады пакуль не жадаюць губляць аўтарытарны кантроль над адукацыйнай сферай. Важным патрабаваннем да “балонцаў” з’яўляецца аўтаномнасць устаноў адукацыі, самастойнасць прыняцця ўсіх важных рашэнняў. Беларускай сістэме прыйшлося б адмяніць многія рычагі ўціску на студэнтаў і працоўны калектыў: сістэмы размеркавання, прызначэння рэктараў “зверху”, кантроль за зместам навучання і г.д.

Беларуская сістэма хоча пераняць толькі “лепшае” (чытай: самае бяспечнае) ад еўрапейскай, баючыся моцна адыходзіць ад савецкай сістэмы, узважваючы кожны крок і нязменна называючы гэта “уласным шляхам”.

Яшчэ адна праблема – для таго, каб адпавядаць еўрапейскаму ўзроўню адукацыі, студэнт мусіць мець доступ да ўсіх сучасных крыніц ведаў. Гэта прадугледжвае наяўнасць у ВНУ навуковых бібліятэк з матэрыялам на арыгінальных мовах, якія пастаянна абнаўляюцца, сучасных лабараторый з найноўшым абсталяваннем. На Беларусі гэта цяжка ўявіць нават у лепшых сталічных вну, не кажучы пра правінцыйныя.

Таксама небяспекай для айчынных універсітэтаў з’яўляецца і адзіныя крытэрыі ўзроўню навучання, пільны кантроль якасці адукацыі і далучэнне да ацэнкі дзейнасці ВНУ студэнтаў і працадаўцаў. Раней ўсе ў адзін голас казалі, што нашая сістэма адукацыі – адна з лепшых, бо не было з чым яе параўноўваць. Балонская сістэма стымулюе канкурэнцыю паміж навучальнымі ўстановамі. Ці вытрымае яе наш універсітэт?

Ды і наогул, ці зможам мы адмовіцца ад звыклай нам аўтарытарнай сістэмы, дзе за цябе ўсе вырашаць і скажуць канкрэтна, што рабіць, дзе самому застаецца быць паслухмяным і правільна выконваць загады? Бо самому адказваць за сябе, як таго патрабуе новая мадэль адукацыі, вельмі рызыкоўна і складана.

**Стэфанія МАЛЮТА**

# СТУДЭНТЫ ЗАСТАНУЦЦА ГАЛОДНЫМІ?

**Днямі ў рэдакцыю Інфармацынага берасцейскага партала dzedzich.org прыйшоў ліст ад аднаго з нашых сталых чытачоў. Мы прапануем яго вашай увазе.**

*Добрый день! Пишет Вам студентка первого курса Наталья В. Решила с Вами поделиться проблемой нашего университета.*

*Дело в том, что я учусь во вторую смену в «старом корпусе». В день обычно бывает по три-четыре пары. Конечно же, находясь такое количество времени в университете, мы нуждаемся в горячем питании. Делаю акцент именно на слове *горячее*, поскольку питание есть, но в основном это или что-то сухое (вафли, чипсы, булочки, в лучшем случае бутерброды) или остатки от того, что было приготовлено для студентов в первую смену. Почему такая несправедливость? Чем вторая смена хуже первой?*

*В университете мне сказали, что горячее питание как таковое для второй смены не предусмотрено, потому что это не выгодно - маленькая выручка. Мне кажется, что здесь явно нарушаются права студентов. Как быть и что отстаивать в данной ситуации?*

*С Уважением Наталья В.*

## ПОШТА “ДЗЕДЗІЧА”

**АД РЭДАКЦЫІ:**

Паважаная Наталля!

Паколькі ў дадзенай сітуацыі развязаць праблему можа толькі адміністрацыя універсітэта, мы вырашылі надрукаваць Ваш ліст у «Дзедзічы» са спадзяваннем, што кіраўніцтва БрДУ зверне ўвагу на праблему і адкажа Вам праз наша выданне.

Будзем з нецярпеннем чакаць адказу ад адказных супрацоўнікаў БрДУ на адрас:

г. Берасце, вул. Маладагвардзейская, 14/1
ці на е-мэйл: dzedzich@tut.by.

# КАНЦЛАГЕР ДЛЯ ЖЫВЁЛЫ

**Грамадскае аб'яднанне абароны жывёлаў "Эгіда" 16 снежня напісала адкрыты ліст прэзідэнту РБ з просьбаю падтрымкі ў стварэнні першага прытулку для бяздомных жывёлін. "Эгіда" заклікала усіх неабыякавых падтрымаць ініцыятыву і напісаць такі ж ліст ад свайго імя.**



Такім чынам у адміністрацыю Прэзідэнта былі накіраваны тысячы лістоў (у акцыі прынялі ўдзел і актывісты "Дзедзіча"). Кіраўнік адміністрацыі Прэзідэнта В. Макей даручыў разабрацца з гэтай справай старшыні Менгарвыканкама Н. Ладуцьку.

Нарэшце Ладуцька заявіў, што пра будаўніцтва прытулку не можа быць гаворкі, бо ў яго "имеются более тысячи подписей от граждан, которые хотят, чтобы в Минске за счет налогоплательщиков была построена «гостиница для животных» и ни одного письма, кроме как от ООЗЖ «Эгида» , о том, что граждане хотели бы в городе Минске иметь приют для животных".

Але валанцёрам "Эгіды" вядома, што прэзідэнту былі накіраваныя тысячы заяў з просьбай будаўніцтва менавіта прытулку. Выявілася, што лісты ад грамадзян не даходзяць ні да прэзідэнта, ні нават да яго адміністрацыі. "У нашай краіне паняцці "грамадства" і "дзяржава" – паняцці розных палюсоў, – зрабілі выснову актывісты абароны жывёл. – Праблемы, якія хвалююць грамадства, абсалютна не хвалююць чыноўнікаў".

## ВАРВАРСТВА І ЦЫВІЛІЗАЦЫЯ

Беларусь, такім чынам, застаецца адзінай краінай у Еўропе, дзе няма прытулку для тых, хто па віне самога ж чалавека апынуўся на вуліцы. Да таго ж, у нас няма закона аб абароне жывёл. Усе спробы разгляду такога законапраекта (цягам 8 год) скончыліся нічым. І гэта пры тым, што ў Беларусі няма крымінальнай адказнасці за жорсткае абыходжанне з жывёлай. Адзіны дакумент у адносінах да жывёлы – гэта "Палажэнне пра парадак дзейнасці арганізацыі па адлове, *адстрэле, утрыманні і эўтаназіі* беспрытульных жывёлін». Няўжо мы можам лічыць 21 стагоддзе стагоддзем гуманнасці, калі кожны дзень чалавек забівае тых, з кім жыве побач.

"Мы адказваем за тых, каго прыручылі", і не павінны на гэта забывацца. Як можна патлумачыць, напрыклад, спаленне жыўцом 227 папугаяў на кантрольна-ветэрынарным пункце ў Берасці? Ці тое, што шосты год запар менская ўстанова па адлове і ўтрыманні бяздомных жывёлін "Фаўна горада" парушае палажэнне №23 ад 29.12.2001, згодна якому жывёлін павінны ўсыпляць прэпаратамі, што не выклікаюць у іх фізічных пакутаў. На справе ж сталічнае прадпрыемства выкарыстоўвае прэпарат Т-61, забароненых да выкарыстання без глыбокага наркозу ў краінах Заходняй Еўропы і ЗША. Катоў і сабак забіваюць шляхам увядзення ін'екцыі ў сэрца, пры гэтым яны адчуваюць моцны боль.

## РАТАВАЦЬ ЖЫЦЦЁ – ШКОДНАЯ СПРАВА

Установа "Фаўна горада", што ў дзяржаўных СМІ часта пазіцыянуецца як прытулак ці "пітомнік" – насамрэч з'яўляецца сапраўдным канвеерам смерці. Нядаўна на сайце "Эгіды" (www.egida.by) былі выкладзены жахлівыя падрабязнасці побыту гэтай установы. Сакрэтам падзяліліся відавочцы-валанцёры, якія добраахвотна даглядалі там нашых меншых братоў. Але усіх, хто спрабаваў звярнуць увагу на жахі "канцлагера для жывёл", звольнілі ці закрылі туды доступ.

Спачатку валанцёрам забаранілі за свае грошы прышчапляць і лячыць жывёлін сапраўднымі добрымі лекамі, а таксама карміць іх. Забаранілі фатаграфаваць сабак і катоў, каб потым размяшчаць на сайтах і ў газетах і такім чынам знаходзіць ім гаспадара. Затым быў жорстка абмежаваны час для прагулак у двары. Большасць валанцёраў працуе ці вучыцца, мае сям'ю, ім цяжка падлажвацца пад гэтыя межы. Бедным жывёлам, пакінутым без прагулак, прыходзілася суткамі стаяць у фекаліях.

Больш за тое, кіраўніцтва "Фаўны горада" неабгрунтавана павялічыла т. зв. "кампенсацыю выдаткаў" для тых, хто хоча забраць з прадпрыемства жывёлу. Зараз, калі ты хочаш выратаваць ад пагібелі сабачку ці коціка, ты мусіш заплаціць суму, якая можа даходзіць да 80-100 тысяч рублеў.

Варта адзначыць, што сродкі на ўтрыманне жывёл бяруцца з падаткаў уладальнікаў сабак. У 2009г. у бюджэт горада ад гэтага збору паступіла 1млрд 130 млн. рублёў.

## ХВАРОБА, БОЛЬ І ЗДЗЕК...

Але самай страшнай заявай былых валанцёраў стала заява аб тым, што установа "Фаўна горада" – крыніца распаўсюджвання інфекцыйных захворванняў. Маленькія шчанюкі, якіх некаторыя людзі прыносяць на прадпрыемства цэлымі каробкамі са спадзяваннем, што ім знойдуць тут гаспадароў, - проста смяротнікі. Яны захворваюць і ўміраюць пасля адной ночы, праведзенай у пакоі.

Такую высокую ступень захворванняў відавочцы тлумачаць так: "Працоўныя не прыбіраюць памяшкання, яны проста паліваюць падлогу са шланга і разганяюць такім чынам экскрэменты і кроў пабітых жывёл па ўсіх вальерах. Гэта спрыяе шырокаму распаўсюду інфекцый, што пагаршаецца яшчэ тым, што усе вальеры маюць бетонную падлогу. А бетон убірае ў сябе вільгаць разам з мікробамі і з'яўляецца крыніцай інфекцыі".

Раней добраахвотныя памочнікі стараліся за свае сродкі вылечваць тых жывёлаў, якіх хацеў нехта забраць. Ветэрынарная служба ж самой "Фаўны" абсалютна нічога не робіць, адсутнічаюць элементарныя меры прафілактыкі. Яны толькі датэрмінова забіваюць хворых жывёлаў, а так як хворымі з'яўляюцца амаль усе, то даглядператвараецца ў павальнае забойства.

Актывісты аб'яднання абароны жывёл распавялі і пра тое, як трапляюць небаракі на канвеер смерці. Часам у нейкім раёне з'яўляецца чалавек, які не любіць сабак ці катоў. Па яго выкліку прыязджае служба па адлове. Яны накідваюць на шыю сабаку "пятлюзашмаргу", як называюць яе эгідаўцы, і цягнуць у машыну. Сабакі з моцнымі шыямі могуць і выжыць. Потым лаўцы закідваюць жывёлін у спецыяльную машыну, дзе да сцяны прыбіты крукі, каб да іх прывязваць "зашмаргі".

Але ў такой сітуацыі грамадства шкадуе толькі саміх лаўцоў, чыя прафесія трапляе пад катэгорыю "з шкоднымі ўмовамі працы".

## ДЗЕ ШУКАЦЬ ДАПАМОГІ?

Старшыня Мінгарвыканкама Ладуцька мусіў правесці перамовы з кіраўніком аб'яднання па ахове жывёл Н. Бялянавай наконт будаўніцтва прытулку і нядобрасумленнай працы у адносінах да бяздомных жывёл на ГП "Фаўна горада", але замест гэтага паехаў у "Фаўну", дзе яму прадставілі ўсе неабходныя паперкі, па якіх ён зрабіў выснову, што прадпрыемства можа выконваць ролю прытулку.

## У БЕРАСЦІ ПРАБЛЕМАЎ НЯМА

А ці ведаеце вы, што першае ў нашай Рэспубліцы (БССР) Таварыства Абароны Жывёл, было арганізавана і зарэгістравана менавіта ў Берасці. З'явілася яно ў 1992 г. і насіла незвычайную назву – "Эхинос".

Берасцейскае гарадское Таварыства абароны жывёл упершыню за ўсю гісторыю існавання падобных арганізацый зрабіла у той час беспрэцэдэнтны крок, – правяло Акцыю па забароне адлову бяздомных жывёлін з ужываннем агністрэльнай зброі. Былі надрукаваныя паштоўкі са змястоўным тэкстам (больш за 200), і разасланыя ва ўсе дзеючыя на той час дзяржаўныя структуры і ўстановы, прыватныя прадпрыемствы і фірмы горада з прапановай прыняць удзел у акцыі.

Зараз у Берасці арганізацыі па ахове жывёл няма. Такія установы працуюць толькі ў Менску, Гародні, Віцебску і Гомелі.

Але мы, берасцейцы, можам уласнымі сродкамі рабіць маленькія добрыя справы, каб палепшыць жыццё нашых меншых братоў .

Не будзем абыякавымі, бо, парушаючы гармонію з прыродай, чалавек асуджае сябе на маральнае і фізічнае знішчэнне.

**Стэфанія МАЛЮТА і Алесь ЖОЛУД**

# ПАЛЯВАННЕ НА ІНТЭРНАЎТАЎ

## ЯК АБАРАНІЦЬ СВАЮ ПЕРАПІСКУ Ў ІНТЭРНЭЦЕ?

**Аператыўна-аналітычны цэнтр пры прэзідэнце атрымаў права кантраляваць інтэрнэт-перапіску беларусаў і сачыць, на якія сайты яны заходзяць.**

Цэнтр з'яўляецца адміністратарам дамена by. У бюджэце ж на 2010 год на цэнтр выдзелілі 12,5 мільярдаў рублёў (амаль 4,5 мільёна даляраў). Некаторыя ўладальнікі сайтаў у байнэце проста ў шоку ад яго паўнамоцтваў. Цяпер з санкцыі можна атрымаць доступ да пошты кожнага чалавека, калі яго сервер знаходзіцца ў Беларусі.

Гэта і слыхавы кантроль, кантроль паштовых адпраўленняў, праслухоўванне размоваў, запіс інфармацыі з тэхнічных каналаў сувязі, а таксама блакаванне сайтаў па рашэнні дзяржаўных органаў, ідэнтыфікацыя карыстальнікаў сеткі, прыцягненне да адказнасці распаўсюджвальнікаў інфармацыі ў інтэрнэце і патрабаванне дзяржаўнай рэгістрацыі інтэрнэт-СМІ.

Некаторыя эксперты кажуць, што ў гэтым ёсць і пазітыўны момант. Тое, што раней магло рабіцца па-за законам, цяпер будзе рэгулявацца заканадаўствам. І каб умяшацца ў таямніцу асабістага жыцця, цэнтру давядзецца атрымліваць санкцыі. Рэч у тым, што падраздзяленне "К", якое займаецца інфармацыйнымі злачынствамі, даўно ўжо існуе пры МУС, а цяпер такія правы нададзеныя і Аператыўна-аналітычнаму цэнтру.

Сёння можна сачыць за ўсімі перамяшчэннямі карыстальніка ў сетцы. Існуе шмат праграмаў па аналізе пакетаў, напрыклад, Wireshark. Яе можа бясплатна скачаць любы. Такую праграмку можна усталяваць на сваім ноўтбуку, прыйсці на працу ў офіс і чытаць, што там калегі пішуць ў асьцы ды кантакце.

Таму лепш карыстацца ананімнымі сеткамі. Там ваш запыт праходзіць праз сотні кампутараў па ўсім свеце і высветліць, адкуль ён прыйшоў, амаль немагчыма. Калі карыстальнік уваходзіць у гэтую сетку, як, напрыклад, Tor, то ўжо ніхто не можа бачыць, на які сайт ён пайшоў. Так жа, як сам сайт не можа бачыць, адкуль прыйшоў гэты карыстальнік.

Для перапіскі эксперты прапануюць Skype. Ён лічыцца найбольш бяспечным. Хаця, напрыклад, у Кітаі і яго можна "ўзламаць". Што тычыцца пошты, то лепш карыстацца абароненым пратаколам https — гэта лічыцца самым бяспечным. Такі пратакол выкарыстоўвае, напрыклад, сервіс gmail.com і tut.by. Але і тут ёсць свая небяспека: калі дасылаць ліст з gmail.com на, напрыклад, mail.ru, дзе няма https, то гэтае паведамленне лёгка перахопліваецца, бо ідзе па небяспечным канале да другога карыстальніка.

Спецыяльны софт, усталяваны на сервер правайдэра, можа аналізаваць увесь трафік па ключавых словах і перасылаць паведамленні ў спецслужбы або нават затрымліваць іх, каб яны не даходзілі да іншага карыстальніка.

Напрыклад, калі вы напішаце ў "асьцы" свайму сябру слова "бомба", якое забіта ў базе, то гэтае паведамленне і ўсе наступныя аўтаматычна будуць адасланыя ў спецслужбы. А калі ў пасланні нешта вельмі сур'ёзнае, то яно можа нават не дайсці.

**ЕЎРАРАДЫЁ**


## АБ'ЯВЫ

БЕРАСЦЕЙСКАЯ АБЛАСНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ
**ПАРТЫІ БНФ**

**распачынае ў Берасці новую агульнагарадскую кампанію "Разам за утульны горад".**

**СТАНЬ СЯБРАМ ПАРТЫІ БНФ!**

Разам мы:
- Пабудуем сучасную эфектыўную гаспадарку;
- Усталюем парадак і вяршэнства Закона;
- Абаронім незалежнасць нашай Радзімы;
- Знішчым усеўладдзе і карупцыю чынавенства.

**СТАНЬ СЯБРАМ ПАРТЫІ БНФ!**

Ты зможаш:
- Атрымаць кваліфікаваную прававую дапамогу ў складаных жыццёвых сітуацыях;
- Прайсці курсы палітычнай і грамадзянскай адукацыі ў Беларусі і за мяжой;
- Зрабіць кар'еру адукаванага і перспектыўнага палітыка;
- Наладзіць кантакты з нашымі партнёрамі ў краінах Еўропы;
- Знайсці новых сяброў, з карысцю для сябе і для Бацькаўшчыны праводзіць вольны час.

**СТАНЬ СЯБРАМ ПАРТЫІ БНФ,** каб шчыра казаць сваім дзецям і ўнукам: "Я зрабіў усё, каб ваша жыццё было шчаслівым"!

**Як стаць сябрам партыі БНФ?**
Тэлефануй: (029) 641-20-98, (029) 222-58-28.

**Абласная арганізацыя Партыі БНФ**

УВАГА!!!

**Абвяшчаецца дадатковы набор карэспандэнтаў у склад рэдакцыі бюлетэня "Дзедзіч"**

Студэнтаў, настаўнікаў, журналістаў, вучняў старэйшых класаў і ўсіх, хто жадае:
- Выказаць свае думкі,
- Навучыцца пісаць артыкулы,
- Зірнуць на навакольны свет вокам журналіста,
- Стаць ля вытокаў стварэння новай моладзевай газеты,

**просім звязацца з намі па тэл.:**
(029) 660-57-41 (Дзмітрый),
(029) 222-58-28 (Уладзімір).

**Таксама запрашаем да супрацоўніцтва мастакоў, карыкатурыстаў, фатографаў.**

**Прэс-служба "ДЗЕДЗІЧА"**


# ПОДВАЛ – ЛУЧШЕЕ МЕСТО ДЛЯ ТВОРЧЕСТВА?

**В БрГУ на психолого-педагогическом факультете находится кафедра теории и методики эстетического воспитания, которая включает в себя 2 специальности: "Музыкальное искусство" и "Изобразительное искусство и черчение, народные художественные ремесла".**

Не многим известно, в каких условиях вынуждены заниматься будущие педагоги. Из-за нехватки помещений занятия проходят в общежитии и в двух маленьких помещениях подвала старого корпуса. Разумеется, в общежитии нет никаких условий для работы.

*– Очень старые мольберты, которые постоянно ломаются, – отмечает студентка Татьяна. – Удлинители для проводки тока неисправны, работать с ними опасно. Ремонт не делался уже много лет (окна разбиты, трещины на потолке, осыпается штукатурка, на окнах и подоконнике отлущилась краска, на полу паркет весь постирался).*


Хоть и не красавцы, но самые настоящие грибы растут в учебном помещении

*Находиться в таких помещениях неприятно и просто опасно для жизни. В подвале мало места, поэтому там очень сложно организовать свою работу. Все занятия – по соломке, керамике, различным видам батика, гобелену, художественному проектированию, гипсовому моделированию и практикуму – проходят в одном помещении, здесь же хранятся и все изделия. Как одно помещение может выполнять столько функций? Оно плохо вентилируется, много пыли появляется при обработке изделий.*

*Что касается второго помещения в подвале, то это особый случай. Там сыро, и на окнах растут красавцы-грибы! Насколько мне известно, грибы очень опасны для здоровья – они помогают развиваться раковым клеткам, а также приводят к онкологическим заболеваниям. А здесь проходят занятия по скульптуре. Какому огромному риску подвержены преподаватели и студенты ВУЗа!*

В связи с этим возникает вопрос: куда же уходят деньги, которые студенты-платники перечисляют каждый семестр на счет университета? Может, на строительство зимнего дворца?… В то время, как студентам приходится учиться в таких условиях.

**dzedzich.org**

## ДАРЭЧЫ

Дні нараджэння - рэч вельмі карысная. Як сцвярджае статыстыка, чым больш іх у чалавека, тым даўжэй ён жыве....

***

Старасць - гэта калі ў жыцці падзеі перастаюць адбывацца і толькі рэчы працягваюць здарацца.

***

Калі не паспееў уставіць - гэта спазненне, а калі не паспееў выняць - затрымка.

***

Калі жонка падчас сэксу думае пра тое, што вы няроўна павесілі шторы - значыць і рукі таксама ў вас не адтуль растуць.

***

Дзяўчыны напампоўваюць сабе грудзі, адзяваюць дэкальтэ, міні-спадніцы і шпількі, а потым абураюцца, што мужыкам толькі адно і трэба. Усё адно, што стаяць за прылаўкам з апельсінамі і жаліцца, што ніхто кнігі не пытае...

***

У аднаго навукоўца нарадзіліся двайняты. Аднаго ён ахрысціў у храме, а іншага пакінуў у якасці кантрольнага ўзору.

***

У выніку ўрагану пагалоўе скаціны Менскай вобласці павялічылася за кошт пагалоўя скаціны Віцебскай вобласці.

***

Жанчыны выходзяць замуж, каб займацца сэксам 6-7 разоў на тыдзень. Мужчыны для гэтага разводзяцца...

***

Калі пустая шкляначка з-пад ёгурта ў ракавіне, значыць лыжка павінна быць у сметніцы...

***

- Па якой прафесіі вучышся?
- На асфальтаўкладчыка.
- Наасфальтаўкладчык... Амапаўцам будзеш?

***

Некаторыя дзяўчыны па прыродзе сваёй настолькі раўнівыя, што прынц на белай кабыле іх ужо не задавальняе.

***

Муж вярнуўся з камандзіроўкі. Жонка:
- Ну як?
- Дарагая, ты ў мяне лепшая за усіх! А ты як?
- Не адзін ты так думаеш.

***

Сяброўка пытае бландынку:
- Чаго сумная?
- У пасольстве анкету не прынялі на візу.
- Чаму?
- У самым канцы, у графе «Не запаўняць», я напісала «Добра».

***

- Чаму бландынка стаіць 2 гадзіны перад працуючым эскалатарам не адрываючы ад яго погляду?
- Лічыць прыступкі...

***

А ніхто не задумваўся - чаму на гузіку «паўза» 2 палоскі?

***

Калі чалавек стамляецца змагацца - ён робіць выгляд, што стаў мудрэйшы.

Мужчыны выбіраюць сабе ў жонкі жанчыну, якая адпавядае іх колу, адукацыі і інтэлекту...

А потым пры кожнай нагодзе крычаць, што ўсе бабы - дуры.

***

- Як завецца Ваша дысертацыя?
- «Як рэшатам ваду насіць».
- Ну што Вы, галубчык! Хто ж так дысертацыюназывае? Назавіце яе так:
«Аналіз праблем транспартавання рэчыва ў вадкім агрэгатным стане ў пасудзінах з перфараваным дном».
- Прафесар, а як звалася Ваша дысертацыя?
- «Уплыў рускіх народных музычных кнопкавых інструментаў на развіццё рэлігійна-філасофскай думкі Расеі канца XVIII – пачатку XX стагоддзяў».
- Гэта значыць, «На храна папу баян»?

***

Гаішнік спыняе машыну. З машыны выходзіць не зусім цвярозая дзяўчына. Гаішнік:
- Так, язда ў нецвярозым стане...
- Сам ты язда!

***

Ідуць дзве бландынкі па лесе па елку. Гадзіну ідуць... другую... трэцюю... Адной надакучыла і яна кажа:
- Годзе, Машка! Зараз ссякаем першую ёлку, якая патрапіцца, нават калі яна не упрыгожаная!!!

***

Званок у аварыйную гаргаза:
- Сынкі, што такое? Духоўку з раніцы ўключыла а газ не гарыць!
- Бабуля, а вы запалку запальвалі?
- О, і праўда! Дзякуй, сынкі, зараз запалю…

***

Жонка мужу:
- Сёння сыходжу з дзяўчынкамі на дыскатэку, будзем танцаваць да раніцы!
- Нікуды ты не пойдзеш!
- Я не пайду?! А што мне можа перашкодзіць?!
- Ну, напрыклад, сіняк пад вокам...

***

Дакладны выклад часткі інтэрв'ю, узятага жанчынай-дыктарам у генерала амерыканскай арміі Рэйнвальда на Нацыянальным Грамадскім Радыё Амерыкі. Генерал збіраўся спансіраваць візіт каманды байскаўтаў на ваенную базу для праходжання пачатковай ваеннай падрыхтоўкі. Вядучая:
- Такім чынам, генерал Рэйнвальд, чаму вы збіраецеся вучыць гэтых маладых дзяцей, калі яны наведаюць вашу базу?
- Мы збіраемся вучыць іх лазіць, сплаўляцца на каноэ, страляць з лука і вінтоўкі.
- Страляць з вінтоўкі! Гэта трохі безадказна, ці не так?
- Не бачу чаму, яны будуць рабіць гэта пад строгім наглядам.
- Вы не дапускаеце, што гэта жудасна небяспечнае ўменне, каб вучыць яму дзяцей?
- Не разумею чаму. Мы навучым іх правільнаму абыходжанню з вінтоўкай перш, чым яны змогуць дакрануцца да курка.
- Але вы даяце ім неабходныя навыкі, каб стаць забойцамі!
- Ну, вы, напрыклад, валодаеце ўсімі неабходнымі навыкамі, каб стаць прастытуткай, але вы ж не прастытутка?!
... радыё замоўкла, інтэрв'ю скончылася.

### 10 ГІСТАРЫЧНЫХ ФАКТАЎ ПРА ЖЫЦЦЁ ПІСЬМЕННІКАЎ

**10.** Вальтэр высмеяў герцага Рогана за яго фанабэрыстасць. Герцаг загадаў сваім слугам пабіць Вальтэра, што і было выканана. Вальтэр выклікаў герцага на двубой, але герцаг адмовіў, бо Вальтэр не быў дваранінам.

**9.** Бамаршэ пасля прэм'еры сваёй п'есы «Вяселле Фігаро» быў арыштаваны і пасаджаны ў турму. Людовік XVI, гуляючы ў карты, напісаў загад пра арышт на сямёрцы пік.

**8.** Знакаміты філасаф Спіноза жыў з таго, што паліраваў шкло для аптычных прылад. Памёр ад сухот (1677 г.)

**7.** Чарнышэўскі пасля двух гадоў турмы быў асуджаны на чатырнаццаць гадоў катаргі на рудні.

**6.** Мармуровая царква ў Пецярбургу, якую пачалі будаваць пры Кацярыне II з мармуру, дабудоўвалася пры Паўлы цэглай. Паэт Акімаў напісаў:

«Се памятник двух царей,
Обоим столь приличный:
На мраморном низу
Воздвигнут верх кирпичный».

За гэта чатырохрадкоўе паэту адрэзалі вушы і язык і саслалі ў Сібір.

**5.** Пра смерць Лермантава, сасланага на Каўказ, Мікалай I сказаў: «Сабаку – сабачая смерць!».

**4.** Л.Н. Талстой быў падвергнуты анафеме. Раз у год ва ўсіх цэрквах урачыста абвяшчалася анафема тром асобам: Мазепе, Грышцы Атреп'еву і Талстому.

**3.** Аўтар «Рабінзона Круза» Даніэль Дэфо за сатырычны артыкул у 1703г. быў асуджаны на турэмнае зняволенне. Суткі ён правёў прывязаны да ганебнага слупа на пляцы. Мінакі абавязаны былі ў яго пляваць. Дэфо было тады сорак два гады.

**2.** Знакаміты байкапісец Эзоп быў да таго бедны, што сам сябе прадаў у рабства, каб аддаць даўгі. У той момант яму было трыццаць гадоў.

**1.** Іспанскі драматург Антоніа Сільва быў спалены на кастры 19 кастрычніка 1739г. У той жа дзень у тэатры ішла яго п'еса «Гібель Фаэтона».

### 10 ЦЫТАТ ПРА ЧАС

**10.** Не кажыце пра тое, што ў вас няма часу. Часу ў вас роўна столькі ж, колькі яго было ў Мікеланджэла, Леанарда да Вінчы, Томаса Джэферсана, Луі Пастэра, Альберта Эйнштэйна. - Джэксан Браун;

**9.** Час ляціць - гэта дрэнная навіна. Добрая навіна - вы пілот свайго часу. - Майкл Альтшулер;

**8.** Паміж поспехам і няўдачай ляжыць бездань, імя якой "у мяне няма часу". - Франклін Філд;

**7.** Не ашукваўцеся сваім календаром. У годзе столькі дзён, колькі вы можаце выкарыстаць. Так, у годзе аднаго чалавека ўсяго 7 дзён, у годзе іншага - 365. - Чарльз Рычардс;

**6.** Трэба не марнаваць час, а інвеставаць у яго. - Стывен Кові;

**5.** Звычайны чалавек думае, як бы правесці час. Разумны чалавек думае пра тое, як скарыстаць час.

**4.** Не дазваляйце ўчорашняму дню ўплываць на сябе сёння. - Рычард Нэльсан;

**3.** Адзін з тых адыходаў, які нельга перапрацаваць - марна патрачаны час.

**2.** Вы не можаце забіць час без шкоды для вечнасці. - Генры Дэвід Тора;

**1.** Вы ніколі не зможаце «знайсці» час для чагосьці. Калі вам трэба час, вазьміце яго. - Чарльз Бракстан.

**Дзедзіч** ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ

- **Заснавальнік:** Ініцыятыўная група моладзі
- **Распаўсюджваецца бясплатна**
- **Падпісана ў друк** 18.03.2010 года у 18-00
- **Папера** афсетная, фармат А4, 1,5 ул.-друк. аркуша,
- **Гарнітура** Helios
- Надрукавана на памнажальнай тэхніцы сябраў рэдакцыі

**Галоўны рэдактар:** Дзмітрый ШЫМАНСКІ.
**Рэдакцыйная калегія:** Ю. Агіевіч, П. Белавус, П. Дайлід, Н. Касцючык, Я. Сашко. **Адказны сакратар:** Стэфанія Малюта.

- **Кантактныя тэлефоны: (029) 660-57-41, (029) 782-88-81.**
- **E-mail:** dzedzich@dzedzich.org. **Інтэрнэт:** www.dzedzich.org
- Пры выкарыстанні матэрыялаў бюлетэня спасылкі на крыніцу абавязковыя
- Рэдакцыя можа не падзяляць меркаванні аўтараў і друкаваць артыкулы для далейшай палемікі
- **Наклад** 299 асобнікаў